КОМПЛЕКС АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ КАСТЫКІ: АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ ВЫВУЧЭННЯ

THE COMPLEX OF ARCHAEOLOGICAL SITES KASTYKI: THE MAIN RESULTS OF THE STUDY

М. А. Плавінскі, М. І. Сцяпанава

M. Plavinski, M. Stsiapanava

Белорусский государственный университет, МГЭИ им. А. Д. Сахарова БГУ, г. Минск, Республика Беларусь
plavinsky_arc@mail.ru; mary1067@tut.by
Belarusian State University, ISEI BSU, Minsk, Republic of Belarus

Комплекс археалагічных помнікаў Кастыкі Вілейскага раёна Мінскай вобласці складаецца з курганнага могільніка старажытнарускага часу Кастыкі і шматкультурнага паселішча Кастыкі II. Некропаль у Кастыках функцыянаваў на працягу сярэдзіны XI–XII стст. Ён належаў групе жыхароў Полацкай зямлі, якія здзяйснялі пахаванні па абрадзе інгумацыі, арыентаваныя галовамі на захад. Гэта дазваляе меркаваць, что члены старажытнарускага калектыва, якія пакінулі некропаль у Кастыках, мелі пэўнае ўяўленне аб хрысціянскай пахавальнай абраднасці. Шматкультурнае паселішча Кастыкі II функцыянавала на працягу доўгага часу. У культурным слаі пад курганамі, у міжкурганнай прасторы, а таксама ў пераадкладзеным культурным слаі, з якога складаюцца насыпы, знойдзены матэрыялы позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы, посуд позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і другой чвэрці I тыс. н.э., а таксама рэчавы і керамічны наборы, характэрныя для банцараўскай культуры трэцяй чвэрці I тыс. н.э.

Complex of archaeological sites Kastyki in the Viliejka district of the Minsk region consists of the Old Rus' time barrow cemetery Kastyki and the multicultural open settlement Kastyki II. Necropolis in Kastyki functioned during the middle of the 11th–12th centuries. It belonged to a group of residents of the Polatsk land, who made burials according to the rite of inhumation with their heads directed to the west. This suggests that the members of the Old Rus' community, which left the necropolis in Kastyki, had a certain understanding of the Christian burial rites. Multicultural settlement Kastyki II had functioned for a long time. In the cultural layer under the mounds, in the inter-mound space, as well as in the re-laid cultural layer of which mounds consist, were found materials of the late Neolithic period and the beginning of the Bronze Age, vessels of the late hatched pottery culture and the second quarter of the 1st millennium AD, artifacts and pottery sets characteristic for Bancaraŭščyna culture of the third quarter 1st millennium AD.

Ключавыя словы: комплекс археалагічных помнікаў, курганны могільнік, селішча, вярхоўі Віліі.

Keywords: complex of archaeological sites, barrow cemetery, open settlement, Vilija upper reaches.

Месцазнаходжанне і гісторыя вывучэння комплекса археалагічных помнікаў Кастыкі

Комплекс археалагічных помнікаў Кастыкі складаецца з курганнага могільніка старажытнарускага часу і паселішча Кастыкі II, культурны слой якога ўтрымлівае матэрыялы позняга неаліту, пачатку эпохі бронзы, позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі, другой і трэцяй чвэрцяў I тыс. н.э.

Курганны могільнік Кастыкі з'яўляецца адным з першых некропаляў, аб раскопках якога, што адбыліся яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., мы маем дастаткова надзейную інфармацыю, апублікаваную аўтарам гэтых прац – К. П. Тышкевічам.

Курганны могільнік Кастыкі Людвіноўскага сельскага савета Вілейскага раёна Мінскай вобласці знаходзіцца ў вярхоўях ракі Віліі, на яе правым беразе, за 2,5 км ад упадзення ў яе ракі Сэрвач. Могільнік размяшчаецца ва ўсходняй частцы вёскі Кастыкі на ўсход ад праваслаўнай царквы ў імя Святых Сарака Севасційскіх пакутнікаў (збудаваная ў 1756 г.) і прылеглых да яе дзеючых могілак. Пры гэтым, сёння могілкі ўшчыльную набліжаюцца да курганоў.

На сённяшні дзень курганны могільнік займае дастаткова роўную пляцоўку памерам 110–120 м з захаду на ўсход на 25–30 м з поўначы на поўдзень. З захаду тэрыторыя могільніка абмежаваная дзеючымі могілкамі пры царкве, з усходу – неглыбокім зарослым дрэвамі ярам, з поўначы – грунтавой дарогай, якая адначасова з'яўляецца вуліцай вёскі Кастыкі, з поўдня і паўднёвага ўсходу – карэнным берагам ракі Вілія.

Упершыню археалагічныя раскопкі ў Кастыках былі ажыццёўлены К. П. Тышкевічам у 1856 г. Ён даследаваў адзін курган, напаўразбураны ў выніку падмывання карэннага берага водамі Віліі. Ні парэшткаў пахавання, ні якога-небудзь інвентару ў кургане выяўлена не было [7].

У 1973 г. раскопкі курганнага могільніка Кастыкі былі праведзены Я.Г. Звяругам. Даследаванні ажыццяўляліся ў межах вывучэння археалагічных помнікаў зоны затаплення Вілейскага вадасховішча, хаця сам могільнік і не

мусіў патрапіць пад ваду. Я. Г. Звяруга зняў план могільніка і раскапаў 7 пахавальных нысыпаў з 20 захаваных на той момант (на знятым плане курганы атрымалі скразную нумарацыю ад 1-га да 20-га [2]).

Звесткі аб даследаваннях 1973 г. былі часткова прыведзены ў манаграфіі Я.Г. Звярузі, прысвечанай старажытнасцям Верхняга Панямоння [3]. У ёй даследчык апублікаваў план могільніка і выяўлены падчас раскопак інвентар. У 2001 г. Я. Г. Звяруга выдаў артыкул, прысвечаны курганным могільнікам вярхоўяў Віліі. У гэтай працы ён падрабязна апісвае будову пахавальных насыпаў і выяўлены ў курганах інвентар. На падставе аналізу пахавальнага інвентара і абрада даследаваных у Кастыках насыпаў, Я. Г. Звяруга датаваў час функцыянавання могільніка ў межах XI–XII стст. [4]. Апошні раз да публікацыі матэрыялаў раскопак у Кастыках Я. Г. Звяруга звярнуўся ў манаграфіі 2005 г., прысвечанай старажытнасцям Беларускага Павілля жалезнага веку і эпохі ранняга Сярэднявечча. У ёй аўтар коратка пералічвае і апісвае пахавальны інвентар некропаля, перапублікоўвае планы і профілі чатырох курганоў, а таксама прамалёўкі керамікі з артыкула 2001 г., і графічныя выявы іншага інвентара з манаграфіі 1989 г. [5].

У 2016 г. раскопкі ў Кастыках былі адноўленыя археалагічнай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. А Плавінскага. Асноўнымі мэтамі новага этапа даследаванняў былі: удакладненне тапаграфіі могільніка, характару будовы пахавальных насыпаў і выяўленне наяўнасці пад курганамі культурнага слою. У выніку прац, праведзеных у 2016 г., была даследавана агульная плошча 166 кв.м (Раскопы I і II, Шурфы I і II) і вывучаны курган 4 (паводле нумарацыі Я. Г. Звярузі), які змяшчаў пашкоджанае пахаванне па абрадзе інгумацыі. З прычыны таго, што тэрыторыя некропаля даследавалася суцэльнай плошчай, было вызначана, што ён размяшчаецца на месцы шматслойнага паселішча, з культуранага слоя якога і насыпаліся курганы. У 2018 г. у Кастыках быў дадаткова закладзены Шурф III плошчай 12 кв.м. Яго распрацоўка ажыццяўлялася з мэтай удакладнення межаў распаўсюджання культурнага слою паселішча і яго датавання.

Датаванне і пахавальны абрад курганнага могільніка Кастыкі на падставе матэрыялаў раскопак 1973 г.

Варта адзначыць, што ў адным з сямі даследаваных у 1973 г. насыпаў (курган 15) пахаванне, верагодна, выяўлена не было, а тры даследаваныя ў ім касцякі з'яўляюцца ўпускнымі і належаць да больш позняга перыяду – яны былі здзейсненыя не раней за Новы час.

Адносна вузкае датаванне курганоў 3 (сярэдзіна – другая палова XI ст.), 5 (другая палова XI–XII ст.), 11 (канец XI – пачатак XII ст.), 1 (XII ст.) дазваляе меркаваць, што некропаль у Кастыках функцыянаваў напрацягу сярэдзіны XI–XII стст.

Пахавальны абрад могільніка ў Кастыках адрозніваецца аднастайнасцю і пэўнай стабільнасцю. Ва ўсіх курганах пахаванні па абрадзе інгумацыі змяшчаліся на аснаванні насыпаў. У тых выпадках, калі арыенціроўку целаў нябожчыкаў атрымалася зафіксаваць, яны былі скіраваныя галовамі на захад з большымі ці меншымі адхіленнямі да поўначы ці поўдня. Выключэннем з'яўляецца толькі пахаванне 1 у кургане 5, якое было арыентаванае галавой на поўнач, магчыма, з невялікім адхіленнем да захаду. Пэўных слядоў пахавальных канструкцый ў працэсе раскопак выяўлена не было.

Большасць раскапаных пахаванняў суправаджалася кругавым посудам. Яшчэ адным часта сустракаемым прадметам з'яўляюцца нажы, якія былі выяўлены чатыры разы. Адзінае пахаванне, якое можа быць вызначана як мужчынскае (курган 1), суправаджалася сякерай. Інвентар жаночых пахаванняў складаецца з пярсцёнкаў, шыйнай грыўні (курган 11), шкляных пацерак, якія выкарыстоўваліся і ў якасці ўпрыгажэнняў шыі ў складзе караляў, і для аздаблення галаўных убораў (курган 3), скроневых колцаў. Выяўленыя ў Кастыках скроневыя колцы належаць да двух тыпаў – бранзалетападобных з завязанымі канцамі (курган 11) і пярсцёнкападобных (пахаванне 1 у кургане 5). Бранзалетападобныя скроневыя колцы традыцыйна лічацца тыповым галаўным упрыгажэннем крывічоў.

Аналіз матэрыялаў даследаванняў курганнага могільніка Кастыкі, ажыццёўленых Я. Г. Звяругам у 1973 г., дазваляе меркаваць, што некропаль функцыянаваў на працягу сярэдзіны XI–XII стст. Ён належаў групе жыхароў Полацкай зямлі, якая ажыццяўляла пахаванні па абрадзе інгумацыі на аснаванні насыпаў, скіраваныя галовамі на захад. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе меркаваць, што члены старажытнага калектыву, якія пакінулі некропаль у Кастыках, мелі пэўнае ўяўленне аб хрысціянскай пахавальнай абраднасці.

Матэрыялы даследаванняў 1973 г., не звязаныя з пахавальнымі комплексамі

У працэсе даследавання курганных насыпаў у 1973 г. Я. Г. Звяругам быў выяўлены шэраг артэфактаў, не звязаных з пахавальнымі комплексамі. Найбольш старажытным з іх, верагодна, з'яўляецца каменнае цясла, знойдзенае ў насыпе кургана 1. Каменныя цяслы былі шырока распаўсюджаны ў неаліце і ў эпоху бронзы, але іх выкарыстанне працягвалася і ў раннім жалезным веку.

Астатнія індывідуальныя знаходкі з насыпаў курганоў належаць да больш позняга часу. Найбольшую каштоўнасць для вызначэння храналогіі паселішча, якое папярэднічала функцыянаванню некропаля, маюць знаходкі гліняных праселак. Два з іх – фрагмент з насыпа кургана 3 і цэлае праселка са слядамі другаснага абпалу з кургана 17 належаць да тыпу біканічных. Распаўсюджанне такіх праселак у побыце насельніцтва культур лясной зоны пачынаецца з позназарубінецкага перыяда, хаця час іх найбольш шырокага распаўсюджання прыпадае на трэцюю чвэрць I тыс. н.э. У паўночнай Беларусі, у прыватнасці, у арэале культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, выкарыстанне біканічных гліняных праселак працягвалася да самага канца I тыс. н.э. і нават да пачатку XI ст. У рэгіёне Верхняга Павілля знаходкі біканічных праселак могуць атаясамлівацца са старажытнасцямі банцараўскай

археалагічнай культуры, чыё датаванне вызначаецца ў межах V–VIII стст. Трэцяе праселка, знойдзенае ў насыпе кургана 5, мае дыскападобную форму і можа быць датаванае ў шырокіх межах другой паловы I тыс. н.э.

Вузкае датаванне астатніх знаходак, якія былі выяўленыя падчас даследавання кургана 17 (шыла, ігла, лязо нажа і два фрагменты тачыльных брускоў) не ўяўляецца магчымым. Разам з тым, цалкам відавочна, што яны належаць да часу не раней за мяжу I тыс. да н.э. – I тыс. н.э. – эпохі, калі ў побыце насельніцтва культуры штрыхаванай керамікі Беларускага Панямоння шырока распаўсюджваюцца разнастайныя металічныя вырабы [1; 6]. Такому меркаванню не супярэчыць і наяўнасць у насыпе кургана 17 фрагментаў ляпнога посуду.

Выяўленне такой значнай колькасці розначасовых артэфактаў у насыпах курганоў не пакідае сумненняў у тым, што яны былі насыпаныя з культурнага слою адкрытага паселішча, які ўтрымліваў розначасовыя матэрыялы. Аб тым, што курганы могільніка Кастыкі насыпаныя з культурнага слою, сведчыць і іх стратыграфія. Усе даследаваныя насыпы складаліся з праслоек пяску розных адценняў – чыстага жоўтага пяску і гумусаванага пяску шэрага ці цёмна-шэрага колераў.

Раскопкі курганнага могільніка Кастыкі і адкрытага паселішча Кастыкі II у 2016 і 2018 гг.

На момант аднаўлення даследаванняў могільніка Кастыкі ў 2016 г. у некропалі захаваліся ўсе 20 насыпаў, улічваючы 7 курганоў, адноўленых Я. Г. Звяругам у 1973 г. Стан захаванасці насыпаў можна прызнаць задавальняючым, хаця частка з іх, відавочна, дастаткова сур'ёзна пашкоджана перакопамі. Раскопкі курганнага могільніка Кастыкі ў 2016 г. ажыццяўляліся шляхам распрацоўкі раскопаў і шурфоў, якія ўключалі не толькі насыпы курганоў і прылеглыя да іх раўчукі, але і міжкурганную прастору.

У працэсе раскопак 2016 г. у Кастыках была даследавана агульная плошча 166 м^2 (Раскопы I і II, Шурфы I і II). У выніку вывучэння кургана 4 (Раскоп I) было выяўлена, што ён змяшчаў пахаванне па абрадзе інгумацыі на аснаванні. На жаль, ступень пашкоджанасці насыпу і парэшткаў трупапакладння не дазваляюць выказваць пэўныя меркаванні аб арыенціроўцы цела і асаблівасцях пахавальнага абраду. Разам з тым, захаваныя прадметы інвентару даюць магчымасць датаваць курган другой паловай XI – пачаткам XII ст., што цалкам укладаецца ў храналагічныя межы функцыянавання некропаля, вызначаныя на падставе аналізу матэрыялаў раскопак 1973 г.

Частковае вывучэнне кургана 5, раскапанага у 1973 г., выявіла перспектыўнасць паўторных раскопак раней даследаваных у Кастыках пахавальных насыпаў. Па-першае, гэтыя працы дазволілі ўдакладніць асаблівасці методыкі раскопак Я. Г. Звяругі. У працэсе разбору пахавальных насыпаў збор пераадкладзеных разам з культурным слоем паселішча індывідуальных знаходак і масавых матэрылаў не ажыццыўляліся. Па-другое, паўторнае частковае вывучэнне кургана 5 дазволіла выявіць культурны слой пад ім і раўчук, прылеглы да насыпу з усходу.

З прычыны таго, што тэрыторыя курганнага могільніка ў 2016 г. даследавалася суцэльнай плошчай, было вызначана, што пахавальныя насыпы старажытнарускага часу ўзводзіліся на месцы адкрытага паселішча Кастыкі II. У культурным слаі пад курганамі і ў міжкурганнай прасторы, а таксама ў пераадкладзеным культурным слаі, з якога складаюцца пахавальныя насыпы, былі выяўлены матэрыялы позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы, посуд позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і, верагодна, другой чвэрці I тыс. н.э., а таксама рэчавы і керамічны наборы, характэрныя для банцараўскай культуры трэцяй чвэрці I тыс. н.э. Пры гэтым, банцараўскія матэрыялы цалкам пераважаюць у складзе керамічнай калекцыі, сабранай падчас раскопак 2016 г. Адпаведна, можна меркаваць, што гаспадарчая актыўнасць на ўчастку адкрытага паселішча Кастыкі II, на якім былі закладзеныя раскопы і шурфы 2016 г., верагодна, найбольш актыўна ажыццяўлялася менавіта ў трэцяй чвэрці I тыс. н.э.

Выяўленне ў насыпах курганоў і культурным слаі ў міжкурганнай прасторы адзінкавых фрагментаў кругавой керамікі позняга Сярэднявечча і Новага часу дае падставы сцвярджаць, што на працягу гэтага перыду тэрыторыя старажытнарускага некропаля магла выкарыстоўвацца ў пэўных гаспадарчых мэтах.

У 2018 г. раскопкі ў Кастыках насілі абмежаваны характар і абмежаваліся распрацоўкай Шурфа III, які быў закладзены ў заходняй частцы тэрыторыі некропаля з мэтай вызначэння межаў распаўсюджання і стратыграфічных асаблівасцяў культурнага слою адкрытага паселішча. Шурф меў прамавугольную форму, выцягнутую па лініі поўнач – поўдзень, памерам 6×2 м і агульную плошчу 12 м^2.

У працэсе вывучэння культурнага слою ў Шурфе III была сабраная калекцыя масавых знаходак, якая налічвае 45 адзінак і ўключае крэмень са слядамі апрацоўкі, металургічны жужаль, фрагменты ляпнога і кругавога посуду. Выключную цікаваць уяўляе знаходка сценкі ляпной пасудзіны з расчосамі, якая датуецца III–V стст. і належыць да старажытнасцяў кола Заазер'е-Узмень, якія генетычна звязаныя з кіеўскай культурай ці, нават, разглядаюцца, як своеасаблівы заходнедзвінскі варыянт кіеўскай культурна-гістарычнай супольнасці. Выяўленне дадзенага артэфакта з'яўляецца дадатковым сведчаннем таго, што адкрытае паселішча Кастыкі II працягвала функцыянаваць і ў другой чвэрці I тыс. н.э.

Нягледзячы на невялікую плошчу Шурфа III, можна адзначыць, што ў складзе выяўленай у ім керамічнай калекцыі значнае месца складюць фрагменты ляпнога штрыхавага посуду позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі. Акрамя таго, знойдзена пяць фрагментаў ляпной чорнай глянцаванай керамікі. Дадзены факт дазваляе ўзняць пытанне аб магчымасці вызначэня ў будучым асаблівасцяў прасторавага развіцця адкрытага паселішча Кастыкі II. Маецца на ўвазе тое, што калі ў паўднёва-заходняй частцы сучаснай тэрыторыі могільніка, у раскопах і шурфах 2016 г., большая частка выяўленых матэрыялаў належыць да трэцяй чвэрці I тыс. н.э., дык у Шурфе III фіксуецца перавага керамікі першых стагоддзяў нашай эры. Разам з тым, невялікая плошча, даследаваная на працягу 2016 і 2018 гг., дазваляе разглядаць дадзенае меркаванне толькі ў якасці рабочай гіпотэзы, якая патрабуе верыфікацыі ў працэсе далейшых палявых даследаванняў.

Вынікі даследаванняў адкрытага паселішча Кастыкі II

Вывучэнне паселішча Кастыкі II у 2016 і 2018 гг. выявіла, што ў культурным слаі пад курганамі і ў міжкурганнай прасторы, а таксама ў пераадкладзеным культурным слаі, з якога складаюцца пахавальныя насыпы, былі выяўлены матэрыялы позняга неаліту і пачатку эпохі бронзы, посуд позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і другой чвэрці I тыс. н.э., а таксама рэчавы і керамічны наборы, характэрныя для банцараўскай культуры трэцяй чвэрці I тыс. н.э.

Варта звярнуць асобную ўвагу на вылучэнне ў культурным слаі адкрытага паселішча Кастыкі II калекцыі керамікі, якая належыць да позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі, фрагментаў посуду другой чвэрці I тыс. н.э. і комплексу матэрыялаў банцараўскай культуры. Нягледзячы на адносна невялікі аб'ём праведзеных даследаванняў, сам факт вывучэння селішча з напластаваннямі позняга этапу культуры штрыхаванай керамікі і банцараўскай культуры ўяўляе відавочную навуковую цікавасць, бо на тэрыторыі Беларусскага Павілля такія селішчы, не прылеглыя да гарадзішчаў, дагэтуль практычна не раскопваліся.

ЛІТАРАТУРА

1. *Егорейченко, А. А.* Культуры штрихованой керамики / А. А. Егорейченко. – Минск: БГУ, 2006. – 207 с.: ил.

2. *Зверуго, Я. Г.* Отчет о полевых исследованиях верхненеманского отряда Белорусской археологической экспедиции в 1973 г. / Я. Г. Зверуго. – Минск, 1974 / Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі. Справа № 449.

3. *Зверуго, Я. Г.* Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я. Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1989. – 208 с.

4. *Звяруга, Я. Г.* Даследаванні курганных могільнікаў у вярхоўях Віліі / Я.Г. Звяруго // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 3. – Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2001. – С. 173–186.

5. *Звяруга, Я.Г.* Беларускае Павілле ў жалезным веку і раннім сярэдневякоўі / Я.Г. Звяруга / Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 10. – Мн.: Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2005. – 174 с.: іл.

6. *Мядзведзеў, А. М.* Аб храналогіі помнікаў культуры штрыхаваній керамікі ў I–V стст. н.э. (па матэрыялах Панямоння) / А. М. Мядзведзеў // З глыбі вякоў: Наш край: Гістарычна-культуралагічны зборнік. – Вып. 1. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – С. 50–57.

7. *Tyszkiewicz, K.* Wilija i jej brzegi: pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. – Drezno: Deukiem i nakladem J.I. Krazsewskiego, 1871. – 362 s.

ЭКОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ РУССКОЙ РЕЛИГИОЗНОЙ ФИЛОСОФИИ
ENVIRONMENTAL ASPECTS OF RUSSIAN RELIGIOUS PHILOSOPHY

Д. Д. Романов
D. Romanov

Российский университет дружбы народов, г. Москва, Российская Федерация
romanovbook@yandex.ru
People's Friendship University of Russia, Moscow, Russian Federation

Место и роль экологической проблематики в русской религиозной философии исследована недостаточно. Однако именно философы «Серебряного века» впервые заговорили о духовной связи человека и природного мира в аспекте божества, об ответственности божественной природы человека за сохранение и преображение космической мировой природы. Среда обитания понимается здесь как область хозяйствования человека, а, следовательно, как зона особой ответственности. Определение человека как спасителя мира предусматривает выстраивание ясной системы ценностей духовного порядка, что особенно важно в постиндустриальную эпоху современности. Экологическое мышление русских религиозных философов, опираясь на концепции всеединства и цельного знания, способно дать ответы на вопросы, поставленные кризисом техногенного общества.

The place and the role of environmental issues in Russian religious philosophy has been studied insufficiently. However, it was the "Silver Age" philosophers who first spoke about the spiritual connection between human being and natural world in divine aspect, about responsibility of human divine nature for the preservation and transformation of cosmic nature. The habitat is understood here as an area of human management, and, therefore, as a zone of special responsibility. Defining a human being as the savior of the world provides for building a clear value system of spiritual order, which is especially important in contemporary post-industrial era. The ecological thinking of Russian religious philosophers, based on all-unity concepts and integral knowledge, is able to provide answers to the questions posed by the crisis of technogenic society.